УДК 616-08-9.28/.29:940.54

# Фарміраванне сістэмы пратэзавання інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе

**© Марцынкевіч І.А.**
***Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны Ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт", Віцебск***

*У дадзеным артыкуле разглядаецца сацыяльная палітыка ў БССР ў адносінах да інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. На аснове афіцыйных дакументаў і архіўных матэрыялаў аўтар звяртае ўвагу на ўмовы і асноўныя матывы, якімі кіравалася ўлада рэспублікі ў адносінах да інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны пры вырашэнні праблемы пратэзавання ў першыя пасляваенныя гады. Разглядае асноўныя прычыны, якія абумовілі цяжкае становішча на першапачатковых этапах фарміравання сістэмы пратэзавання дадзенай катэгорыі грамадзян і вызначае напрамкі, па якіх вялася работа для вырашэння праблемы. Аўтар вызначае асноўныя поспехі, якія былі дасягнуты за першае пасляваеннае дзесяцігоддзе і прыходзіць да высновы, што за гэты перыяд у БССР была закладзена частка агульнай сістэмы забеспячэння пратэзамі інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, якая ў многім задавальняла патрэбы на пратэзаванне ўнутры краіны, аднак, разам з тым, яшчэ патрабавала істотнай дапрацоўкі.*
***Ключавыя словы:*** *БССР, сацыяльнае забеспячэнне, Вялікая Айчынная вайна, інваліды Вялікай Айчыннай вайны, пратэзаванне.*

*(Ученые записки. – 2011. – Том 12. – С. 63–68)*

# Setting up the system of prosthetic appliance provision for Great Patriotic War invalids in the first post-war decade

**© Martsynkevich I.A.**
***Educational establishment "Vitebsk State Oder of Peoples Friendship Medical University", Vitebsk***

*The article considers social policy in the BSSR concerning disabled servicemen and participants of the Great Patriotic War. On the basis of official documents and archaive materials the author pays attention to the conditions and main motives which the republican authorities were directed by in relation to Great Patriotic War invalids while solving the problem of prosthetic appliance provision in the first post-war years. Main reasons are considered of the diffucult situation at the first stages of setting up the system of prosthetic appliance provision for this category of citizens; directions of work to solve the problem are singled out. The author states main successes which were achieved during the first post-war decade and comes to the conclusion that during this period in the BSSR a part of the general system of prosthetic appliance provision for Great Patriotic War invalids was created which to a great extent satisfied the needs for prosthetic alliances in the country. Still considerable work was supposed to be done.*
***Key words:*** *BSSR, social provision, Great Patriotic War, Great Patriotic War invalids, prosthetic appliance provision.*

*(Scientific notes. – 2011. – Vol. 12. – P. 63–68)*

*Адрас для карэспандэнцыі:* пр-т Перамогі, д. 5/2–151(2), 210022, г. Віцебск,
*e-mail:* janka.m@mail.ru – **І.А. Марцынкевіч**

Фарміраванне сістэмы пратэзавання інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе праходзіла ў складаных і супярэчлівых умовах, якія былі абумоўлены тагачаснай рэчаіснасцю. Недастатковая распрацава-насць праблемы ў першыя гады аднаўлення і складаныя матэрыяльныя ўмовы рэспублікі адразу пасля вайны з'яўляліся аб'ектыўнымі фактарамі, якія стрымлівалі хуткія змены ў гэтым напрамку сацыяльнага забеспячэння інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны.

Даследаванне праблемы сацыяльнага забеспячэння насельніцтва як састаўной часткі сацыяльна-эканамічнай палітыкі савецкай дзяржавы ў першыя пасляваенныя гады знайшло сваё адлюстраванне ў савецкай, айчыннай і расійскай гістарыяграфіі. Сярод вядучых даследчыкаў можна назваць В. Дрыца, А. Коцікава, В. Люцко, А. Грыгор'ева, А. Зубкову і інш. Аднак, спецыяльнага даследавання, прыс-вечанага непасрэдна фарміраванню сістэ-мы пратэзавання інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, не праводзілася.

Мэта дадзенага артыкула – аналіз фарміравання сістэмы пратэзавання інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны ў першыя пасляваенныя гады ў БССР. Дасягненне мэты даследавання абумовіла пастаноўку і вырашэнне наступных задач:

– ахарактарызаваць умовы зараджэння сістэмы пратэзавання як састаўной часткі сацыяльнага забеспячэння інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны;

– прааналізаваць асноўныя архіўныя дакументы па праблеме;

– высветліць прычыны маруднага вырашэння праблемы пратэзавання інвалідаў і вызначыць меры, якія прывялі да яе нармалізацыі

**Матэрыял і метады.** Дадзены арты-кул грунтуецца на архіўных матэрыялах і дакументах, а таксама на даследаваннях расійскіх аўтараў. У працэсе яго напісання былі прааналізаваны асноўныя дакументы, якія ляглі ў аснову фарміравання сістэмы пратэзавання інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. Асаблівую цікавасць уяўляюць архіўныя дакументы з фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, прысвечаныя непасрэдна практычнай рэалізацыі прынятых мер па вырашэнні праблемы пратэзавання дадзенай катэгорыі грамадзян. Намі выкарыстоў-валіся як агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя, параўнан-не, абагульненне), так і спецыяльна-гістарычныя метады даследавання (гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны), якія дазволілі паказаць умовы фарміравання сістэмы пратэзавання інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны ў разглядаемы перыяд.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны самым трагічным наступствам стала не толькі гібель 27 мільёнаў савецкіх гра-мадзян, але і шматлікія інваліды, якія аказаліся ў складаным матэрыяльным, фізічным і псіхалагічным становішчы. Ім цяжка было адаптавацца да мірных умоў і знайсці сабе месца ў пасля-ваенным грамадстве. Узнікалі склада-насці з працаўладкаваннем, атрыман-нем адпаведнай медыцынскай дапамогі, уключэннем у мірнае жыццё. Шматлікія цяжкасці былі і ў сем'ях інвалідаў. У першыя пасляваенныя гады ў гарадах і вёсках краіны нярэдка сустракаліся скалечаныя на вайне былыя фран-тавікі, якія нават былі вымушаны жаб-раваць. У народзе ім часта давалі асаблівыя імёны, якія характарызавалі іх скалечанасць: "кастылі", "абрубкі", "тачкі", "печаныя" [5, с. 101–118]. Да пачатку 1950-х гг. такіх інвалідаў можна было сустрэць ў цягніках, на вакзалах і рынках, потым скалечаныя франтавікі і жабракі сустракаліся ўсё радзей. Аднак і праз 10 гадоў пасля заканчэння вайны інваліды-франтавікі складалі яшчэ значную частку насель-ніцтва, якое жабравала. Нават па афіцый-ных, няпоўных дадзеных, у 1954 г. іх агульная

колькасць па СССР склала 2545 чалавек, г.зн. каля 12% ад усіх улічаных (жабракоў). Такія лічбы сведчылі пра недасканаласць савецкай сістэмы сацыяльнага забеспячэння [6, с. 488].

Існаванне вялікай колькасці інвалідаў патрабавала сур'ёзнай і сістэмнай дзейнасці дзяржавы для вырашэння гэтай праблемы. Адным з важных кірункаў працы па рэабілітацыі інвалідаў і ўключэнні іх у грамадскае жыццё і вытворчую дзейнасць у магчымай для іх форме з'яўлялася стварэнне сістэмы пратэзавання інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. Станаўленне гэтай сістэмы прайшло доўгі шлях развіцця і ўда-сканальвалася на працягу дзесяцігоддзяў.

Сітуацыя ўскладнялася тым, што ва ўмовах пасляваеннай разрухі на тэрыторыі БССР не існавала ніводнага прадпрыемст-ва, якое б хоць часткова магло задаволіць вострую патрэбу ў пратэзаванні. Пытанне насіла не толькі медыка-сацыяльны, але і маральна-этычны характар.

У такіх умовах кіраўніцтвам рэспублікі, а таксама органамі ўлады на месцах, а менавіта старшынямі выканкамаў, дадзе-нае пытанне было ўзята на асабісты кантроль і прыняты першапачатковыя меры па выпраўленні сітуацыі, якая скла-лася. З мэтай змяніць становішча адпа-ведная праблема разглядалася 5 красавіка 1945 года на пасяджэнні СНК БССР і была прынята пастанова "Аб мерапрыемствах па паляпшэнню патрэб у пратэзаванні інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны і іншых катэгорый па БССР". Выдзяляліся значныя сродкі для яе рэалізацыі. З мэтай задавальнення патрэб у пратэзаванні інвалідаў вайны было вырашана абавязаць старшынь абласных выканкамаў Магілёўс-кага, Бабруйскага, Гродзенскага саветаў дэпутатаў працоўных да 20 красавіка 1945 года арганізаваць ў гарадах Магілёве, Бабруйску, Гродна па адной пратэзнай майстэрні абласнога падначалення з колькасцю кваліфікаваных работнікаў не менш за 20 у кожнай. На старшынь Магілёўскага, Гродзенскага і Віцебскага выканкамаў ускладалася і задача бесперабойнага забеспячэння пратэз-ных майстэрняў электраэнергіяй, а старшыня Мінскага гарадскога савета да 20 красавіка 1945 года павінен быў выдзеліць Наркамсабесу БССР памяш-канне для арганізацыі ў горадзе Мінску прымерачнай і інтэрната на 10 чалавек для інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, якія прыязджалі на прымерку і атрыманне пратэзаў.

Укамплектаванне пратэзных майс-тэрняў неабходнымі кваліфікаванымі кадрамі трэба было правесці за кошт дзеючых арганізацый мясцовай пра-мысловасці, прамкааперацыі і іншых крыніц. Гэты факт сведчыць пра тое, што на час выдання пастановы ў краіне не толькі не хапала пратэзных майстэр-няў, але і адсутнічала неабходная колькасць прафесіяналаў-пратэзістаў.

Акрамя таго, у другім квартале 1945 года Наркамсабесу БССР для арганіза-цыі пратэзных майстэрняў выдзяляліся неабходныя абсталяванне, інструменты і матэрыялы. Народнаму камісарыяту гандлю БССР было даручана харчовае забеспячэнне працоўных пратэзных майстэрняў па нормах асобага спісу. Паколькі існавала праблема недахопу матэрыялаў, з якіх выраблялісе пратэ-зы, то на Наркамсабес БССР усклада-лася першачарговая задача па забеспя-чэнні арганізуемых пратэзных майстэр-няў неабходнымі паўфабрыкатамі.

Цікавым з'яўляецца той факт, што згодна з дадзенай пастановай адбыліся і некаторыя змяненні ў вышэйшых кіруючых органах краіны. Была зацвер-джана дадатковая штатная адзінка намесніка старшыні сацыяльнага забеспячэння па пратэзнай прамысловасці, а замест аддзела пратэзавання быў зацверджаны аддзел пратэзнай вытвор-часці [1, арк. 1].

Нягледзячы на такія сур'ёзныя

меры, прынятыя урадам, сітуацыя з пратэзаван-нем змянялася ў лепшы бок вельмі марудна. Пратэзаў па-ранейшаму не хапала, а ў рабоце толькі што арганізава-ных майстэрняў па вырабе пратэзаў было шмат недапрацовак і недахопаў. Паста-новы рэспубліканскага саўнаркама не выконваліся ў поўным аб'ёме. Прыкладам такога невыканання з'яўляецца пастанова СНК БССР ад 27 снежня 1945 года № 958, згодна з якой пратэзныя прадпрыемствы Наркамсабеса БССР павінны былі штомесяц вырабляць і здаваць 100 пар пратэзнага абутку для задавальнення патрэб інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. Аднак названая пастанова СНК БССР не выконвалася. За 6 месяцаў 1945 года замест 600 пар было выраблена і перададзена прадпрыемствам пратэзнай прамысловасці толькі 50 пар абутку. Пры ўсіх прынятых мерах, у сувязі з тым, што пратэзныя прадпрыемствы БССР на працягу 1945 года выраблялі толькі пратэзы для інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, якія знаходзіліся ў эвакуяваных шпіталях, за гэты час збіраліся шмат заказаў ад інвалідаў-франтавікоў, што прыбылі раней на месца свайго былога жыхарства.

Існуючыя пратэзныя майстэрні ў Мінску і Гомелі ў гэты час мелі поўную загрузку на 4 месяцы наперад, а зноў арганізаваныя пратэзныя майстэрні ў Віцебску, Магілёве, Бабруйску рабілі толькі артапедычны абутак і выраб пратэзаў не асвоілі. У такіх абставінах Народны камісарыят сацыяль-нага забеспячэння БССР нават быў вымушаны звярнуцца да кіраўніцтва рэспублікі з просьбай аб дазволе спыніць прыём заказаў на тры месяцы для выканання ўжо прынятых заказаў і для асваення вырабу пратэзаў зноў арганізаванымі майстэр-нямі [3, арк. 95].

У выніку такой сітуацыі інваліды Вялікай Айчыннай вайны, якія скончы-лі лячэнне ў шпіталях, атрымлівалі пратэзы без абутку, што выклікала хуткі знос пратэзаў і выхад іх са строю [1, арк. 65–66]. Кіраўніцтва рэспублікі прымала тэрміновыя меры па забеспя-чэнні паставак прапанаванай колькасці абутку і іх перадачы пратэзным прадпрыемствам Наркамсабеса БССР. СНК БССР 11 кастрычніка 1945 года прыняў пастанову "Аб мерах па дапамозе пратэзным прадпрыемствам Наркамата сацыяльнага забеспячэння БССР", у якой прадугледжвалася правядзенне аддзелам сацыяльнага забеспячэння ў 4-м квартале 1945 года месячных курсаў па падрыхтоўцы кадраў спецыялістаў-пратэзнікаў у колькасці 30-ці чалавек [1, арк. 88].

Усе гэтыя меры, якія былі прыняты за такі кароткі тэрмін, безумоўна, адыгрывалі станоўчую ролю ў стварэнні сістэмы пратэзавання інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны ў рэспубліцы, але ўсіх пытанняў па-ранейшаму не вырашалі, пра што сведчыць ліст першага на-месніка старшыні СНК БССР К.В. Кіся-лёва на імя дырэктара Калінінскага пратэзнага завода (ў горад Калінін) ад 29 кастрычніка 1945 года. У ім, звяртаючыся ад імя СНК БССР, ён просіць вырабіць на гэтым прадпрыемстве 150 пратэзаў і перадаць іх Наркамсабесу БССР. Такую вострую патрэбу і немагчымасць яе вырашэння сіламі прадпрыемстваў рэспублікі К.В. Кісялёў тлумачыў усё тымі ж прычынамі (неўкамплектаванасцю кадраў і недахо-пам матэрыялаў) [1, арк. 86].

Таксама К.В. Кісялёў звярнуўся з просьбай аб дапамозе ў вырашэнні дадзеных праблем да намесніка старшыні СНК СССР В.М. Молатава. У сваім звароце ён паведамляў, што пратэзныя прадпрыемствы БССР толькі арганізаваныя і не ўкамплектаваныя кадрамі, у першую чаргу спецыялістамі-пратэзнікамі, і па колькасці выпускаемай прадукцыі не ў стане на дадзены момант задаволіць патрэбы шпіталяў і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны [1, арк. 87]. Разам з тым, 13 лістапада 1945 года

К.В. Кісялёў звяртаецца да наркама сацыяльнага забеспячэння РСФСР А.М. Сухава з просьбай аказаць Наркамсабесу БССР дапамогу ў выдзяленні гатовых пратэзаў сцягна і галёнкі ў колькасці 500 штук або ў вырабе іх ў г. Калініне і пратэзных майстэрнях ў памежных з БССР гарадах [3, арк. 105–107].

Прымаемыя намаганні прывялі да павелічэння колькасці вырабляемых пратэзаў, аднак была і яшчэ адна праблема, якая не страціла сваёй актуальнасці і праз некалькі гадоў пасля заснавання пратэзных майстэрняў ў БССР. Яна ўзнікла і была звязана з недахопам кваліфікаваных спецыялістаў у гэтай вытворчасці. У прагледжаных справах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь намі выяўлены ананімныя лісты, у якіх інваліды вайны пісалі ў шматлікія інстанцыі і скардзіліся на якасць пратэзных вырабаў. З іх слоў, пратэзы вырабляліся нязручныя, яны ірвалі вопратку і сціралі да крывавых мазалёў цела. Сама прымерка праходзіла няякасна і без адпаведнай увагі супрацоўнікаў майстэрань ў адносінах да інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, што выклікала дадатковыя цяжкасці і праблемы ў карыстанні пратэзамі [2, арк. 405, 407]. Трэба адзначыць, што апошняя з праблем так і не была вырашана і праз дзесяць гадоў пасля вызвалення БССР. Так, у даведцы аб рабоце аддзела сацыяльнага забеспячэння наркамата БССР за 1954 год адзначалася, што па выніках праверкі можна канстатаваць выпуск няякаснай прадукцыі і парушэнне тэрмінаў вырабу пратэзаў [4, арк. 53].

**Заключэнне.** Нягледзячы на ўсе складанасці, у якіх праходзіла фарміраванне сістэмы пратэзавання інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, было зроблена галоўнае – закладзена аснова сістэмы пратэзавання. Па стане на 1 студзеня 1954 года ў БССР мелася 6 пратэзных прадпрыемстваў, якія ўжо поўнасцю забяспечвалі патрэбы інвалідаў па ўсіх відах пратэзаў. За 1954 год іх было выдадзена ўсяго 7416 штук. Інвалідам вайны было перададзена 7663 адзінак пратэзна-артапедычнага абутку.

Яшчэ адным накірункам па паляпшэнні ўзроўню жыцця франтавікоўінвалідаў стала забеспячэнне іх спецыяльнымі сродкамі перамяшчэння. Паступова пашыралася колькасць інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, якія змаглі атрымаць мотакаляскі, а таксама пратэзныя каляскі рычажнага кіравання. Яны значна палягчалі ўмовы жыцця інвалідаў і стваралі лепшыя магчымасці для іх працаўладкавання. Калі ў канцы 40-х гадоў іх па краіне налічваліся адзінкі, то ў пачатку 50-х гг. сітуацыя істотна змянілася ў лепшы бок. Яны атрымалі 280 штук мотака-лясак і 150 пратэзных калясак рычажнага кіравання, тым не менш, патрэба ў іх заставалася яшчэ значнай [4, арк. 56].

Такім чынам, за першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў БССР, як у саюзнай рэспубліцы, была закладзена частка агульнай сістэмы забеспячэння пратэзамі інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, якая ў многім задавальняла патрэбы ў пратэзаванні ўнутры краіны. Разам з тым, гэтая сістэма патрабавала пастаяннай увагі дзяржавы, далейшага ўдасканалення і павелічэння фінанса-вання.

## Літаратура


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Фонд 7. – Воп. 3. – Спр. 1739.
2. НАРБ. – Фонд 7. – Воп. 4. – Спр. 3033.
3. НАРБ. – Фонд 7. – Воп. 4. – Спр. 3059.
4. НАРБ. – Фонд 7. – Воп. 4. – Спр. 3067.
5. Зубкова, Е.Ю. На «краю» советского общества. Маргинальные группы населения и государственная политика в 1940–1960-е годы / Е.Ю. Зубкова // Российская история. – 2009. – № 5. – С. 101–118.
6. Коммунистическая партия Советского

союза в резолюциях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). – М.: Изд-во политической литературы, 1985. – Т. 7: 1938–1945. – С. 488–489.

*Паступіла ў рэдакцыю 23.09.2011 г.*

*Прынята ў друк 12.12.2011 г.*